УДК 373.3:028.5

**Доўгаль Дзмітрый Аляксандравіч**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)
douhal_da@m.msu.by

# АНАЛІТЫЧНЫЯ ЛАНЦУЖКІ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ЧЫТАЦКІХ УМЕННЯЎ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

У артыкуле апісваюцца аналітычныя ланцужкі як сродак развіцця чытацкіх уменняў малодшых школьнікаў. Прапануюцца прыклады выкарыстання дадзенага прыёму пры вывучэнні мастацкіх твораў у пачатковых класах.

**Ключавыя словы:** чытацкія ўменні, кірункі аналізу, аналітычныя ланцужкі

The article discusses analytical chains as a means of developing reading skills in younger schoolchildren. Examples of the use of this technique in the study of works of art in elementary grades are offered.

**Keywords**: reading skills, analysis directions, analytical chains

Неабходнай умовай фарміравання чытацкай кампетэнцыі малодшых школьнікаў з’яўляецца асваенне вучнямі комплексу чытацкіх уменняў. Праг-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

назаванне зместу твора па кампанентах тэксту і ілюстрацыях, работа над загалоўкам і мовай твора, характарыстыка вобразаў-персанажаў, раскрыццё зместу і спасціжэнне ідэі твора, вызначэнне асобаснага стаўлення вучня да твора – тыя ўменні, фарміраванне якіх прадугледжана праграмай вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)” на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Сучасная методыка чытання вылучае тры асноўныя этапы працы над мастацкім творам: першасны сінтэз, аналіз і другасны сінтэз. Фарміраванне чытацкіх уменняў адбываецца на кожным з гэтых этапаў, аднак найважнейшая роля належыць аналізу, які прадугледжвае ўстанаўленне прычынна-выніковых сувязей у развіцці сюжэта, пры тлумачэнні ўчынкаў дзейных асоб ва ўзаемасувязі з вобразна-выяўленчымі сродкамі мастацкага твора.

Асноўным метадам развіцця ўменняў выступае гутарка, вядучым прыёмам – пытанні, якія прапануюцца вучням па змесце і форме прызначанага для вывучэння твора. Метадычная навука вылучае некалькі тыпаў пытанняў, якія выкарыстоўваюцца пры вывучэнні мастацкіх твораў на ўроках чытання [1]:

1) пытанні на разуменне фактуальнай інфармацыі, скіраваныя на высвятленне канкрэтнага зместу твора;

2) пытанні на высвятленне прычынна-выніковых сувязей у развіцці сюжэта, устанаўленне матываў учынкаў і паводзін дзеючых асоб, асноўных рысаў іх характару;

3) пытанні на асэнсаванне падтэкставай інфармацыі, скіраваныя на пранікненне ў эмацыйную танальнасць твора, аднаўленне вобразаў, на абгрунтаванне, аргументацыю, доказ, на ацэнку прачытанага і асэнсаванне аўтарскай пазіцыі.

Пытанні першага тыпу прызначаны для праверкі разумення або пошуку ў тэксце інфармацыі, пададзенай у яўным выглядзе. Яны могуць быць скіраваны на вызначэнне персанажаў твора або адносін паміж імі, устанаўленне абставін (месца, часу, умоў працякання) дзеяння, засваенне сюжэтных перыпетый і канкрэтных дэталяў твора. Такія пытанні прадугледжваюць адназначны адказ пры звароце да тэксту. Прыклады такіх пытанняў у метадычным апараце вучэбнага дапаможніка па літаратурным чытанні [2]: *Хто з’яўляецца героем верша? З якімі незвычайнымі асобамі паэт размаўляе па-беларуску? Які выпадак давялося назіраць паляўнічаму ў лесе? Аб чым просіць аўтар у сонейка і марознага вечара? Куды накіраваліся сябры прыроды?* Нярэдка гэтыя пытанні суправаджаюцца рэкамендацыяй звярнуцца да тэксту з выбарачным чытаннем: *Як паводзіла сябе птушка ў час пажару? Прачытайце адпаведныя радкі; Як пісьменнік тлумачыць паходжанне нашай краіны? Знайдзіце адказ у тэксце і прачытайце.*

Пытанні другога тыпу дазваляюць зразумець матывы дзейных асоб, устанавіць узаемасувязь падзей, спрыяюць разуменню мадэлі паводзін і ма-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ральных прынцыпаў герояў, выяўляюць мэтазгоднасць выкарыстання моўных сродкаў для стварэння мастацкіх вобразаў [2]: *Чаму паляўнічы не ўзяў зайчыка дамоў? Як характарызуе Ганульку яе размова з кветкамі, травамі, вятрамі, палямі, ракой? Ці можна назваць Грышку, Цішку, Стася, Лёўку і Янку сапраўднымі турыстамі? Паразважайце, чаму аўтар гаворыць, што "бабак, сыраежак не возьме і гультай". З-за чаго дзеці не ўзялі Ромку з сабой у грыбы ў другі раз?* Адказы не падаюцца ў тэксце ў гатовым выглядзе, таму такія пытанні могуць суправаджацца ўказаннем на неабходнасць аргументацыі: *Чаму звяры ветліва сустракаюць гэтых вандроўнікаў? Паразважайце; Паразважайце, чаму гусі, баран змаглі ўратавацца ад бяды.*

Апошні з вылучаных тыпаў пытанняў служыць для раскрыцця аўтарскай задумы, спрыяе фарміраванню асобаснага ўспрымання твора вучнямі. Прыклады такіх пытанняў у вучэбным дапаможніку [2]: *Для чаго паэт расказаў гэту смешную гісторыю? З якой мэтай Барыс Сачанка расказаў чытачам пра пасляваенны выпадак з жыцця? Як адносіцца аўтар верша да зімовых свят? Чаму вы так думаеце?Які сэнс уклаў аўтар у радкі: "Снег сцяжынку не замёў, церусіў паволі"?*

Праца з мастацкім творам патрабуе выкарыстання пытанняў усіх адзначаных тыпаў, аднак зразумела, што пытанні кожнага наступнага ўзроўню магчымыя тады, калі вучні паспяхова справіліся з пытаннямі і заданнямі на папярэднім узроўні. На нашу думку, комплекс пытанняў мае найбольшы эфект, калі яны аб'яднаны ў блокі не на аснове ўзроўню складанасці, а выступаюць у выглядзе паслядоўна размешчаных звёнаў. Пры гэтым кожнае наступнае пытанне, развіваючы адказ на папярэдняе, вядзе да больш глыбокага пранікнення ў сутнасць твора. Такія паслядоўна пастаўленыя пытанні мы называем **аналітычнымі ланцужкамі**.

У вучэбных дапаможніках па літаратурным чытанні прапануюцца спробы пабудовы шэрагу пытанняў, адказ на якія дазваляе рухацца ад простага да складанага: *Чым вырашыла здзівіць дзяўчынка гасцей? Як гэта яе характарызуе?* (першае пытанне прызначана для пошуку фактуальнай сюжэтнай інфармацыі, другое дазваляе скласці на яе аснове характарыстыку героя) *Якія словы паўтараюцца ў песні? Якое прызначэнне гэтых паўтораў?* (вывад аб ролі выяўленчых сродкаў робіцца пасля аналізу словаўжывання ў лірычным творы) *Куды накіраваліся сябры прыроды? З якой мэтай яны падарожнічаюць? Як іх гэта характарызуе?* Прапанаваны ланцужок дазваляе ўстанавіць інфармацыю пра абставіны падарожжа герояў, матывы іх паводзін і на гэтай аснове ахарактарызаваць персанажаў твора.

Абмежаваны аб'ём вучэбных дапаможнікаў, аднак, не дазваляе іх аўтарам у поўнай меры выкарыстаць дадзены прыём. Таму настаўнік пры распрацоўцы сцэнарыя заняткаў можа сам увесці ў яго аналітычныя ланцужкі, тым больш што яны ахопліваюць розныя аспекты мастацкага твора і, адпаведна, роз-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ныя кірункі аналізу. Прапануем для прыкладу некалькі распрацаваных намі ланцужкоў да апавядання “Лыжкай па лбе” Івана Муравейкі, якое вывучаецца ў 3-м класе:

*1) Калі адбыліся апісаныя ў творы падзеі? → Дакажыце, што апісаныя падзеі адбыліся ў даўнія часы. → Ці магла б гэта гісторыя здарыцца сёння?*;

*2) Якую сямейную завядзёнку парушыў унук Янка? → Чаму ён гэта зрабіў? → Ці зразумеў Янка, што ён паступіў няправільна?*;

*3) Як дзед Апанас пакараў унука? Зачытайце адпаведныя радкі. → Чаму дзед вырашыў пакараць унука? → Чаму, на вашу думку, дзед не адразу пакараў унука за свавольства?*;

*4) Як аўтар апісвае вочы дзеда Апанаса, калі той пабачыў свавольства ўнука? Прачытайце. → Паразважайце, чаму вочы дзеда параўноўваюцца з агеньчыкамі. → З якога боку гэта параўнанне раскрывае дзеда – з добрага ці дрэннага? Чаму?*

Прапанаваныя ланцужкі ўстанаўліваюць прычынна-выніковыя сувязі паміж падзеямі ў творы, вызначаюць матывы ўчынкаў галоўных герояў, выяўляюць ролю мастацкага слова ў стварэнні вобраза персанажа. Апошняе пытанне кожнага ланцужка скіравана на вызначэнне характарыстык і маральна-этычную ацэнку дзейных асоб, выяўленне ідэйнай сутнасці твора, гэта значыць яно дазваляе завяршыць аналітычную працу сінтэтычнымі абагульненнямі. Акрамя таго, што дадзеныя ланцужкі развіваюць чытацкія ўменні, яны спрыяюць і фарміраванню сінтаксічнага ладу маўлення вучняў, паколькі стымулююць пабудову выказванняў розных тыпаў.

Такім чынам, выкарыстанне аналітычных ланцужкоў на ўроках літаратурнага чытання з’яўляецца эфектыўным сродкам развіцця чытацкіх уменняў малодшых школьнікаў. Паслядоўная пастаноўка пытанняў, аб’яднаных у лагічныя блокі, дазваляе паглыбіць успрыманне зместу твора, устанавіць прычынна-выніковыя сувязі, зразумець матывы паводзін герояў і выявіць аўтарскую задуму. Укараненне аналітычных ланцужкоў у практыку навучання літаратурнаму чытанню спрыяе фарміраванню ў школьнікаў удумлівага і аналітычнага падыходу да мастацкіх твораў, развівае іх здольнасць да самастойнага мыслення і ацэнкі прачытанага.

## Літаратура

1. Шилько, Т. Н. Виды и приемы работы над произведением на уроках литературного чтения / Т. Н. Шилько // Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа. – 2021. – № 9. – С. 9–13.

2. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэбны дапаможнік для 3-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – 2-е выд., перапр. і дап. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2023. – 144 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова